Наша Будучына

Цана асобнага нумару 150 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкаў да хаты 600 м. п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 1. Пятніца, 8-га сьнежня 1922 г. Год I.

Наша будучына.

Цяжкая крыўда запанавала на парэзанай на кускі Зямлі Беларускай.

Сыны аднаго народу аддзеляны адны ад другіх гранічнымі межамі, еднасьць духовага жыцьця разбіта.

А найсьвяцейшыя ідэалы аб незалежным жыцьці нашага народу пад адней страхой утоптаны чужымі людзьмі ў пыл і гразь.

I можа здацца, быццам так ужо і суджана нам вякі вечныя векаваці паднявольнымі і пад'ярмомнымі.

Але здацца гэта можа толькі людзям з кволым духам і малой верай. Бо жывы народ ня ўмірае калі жывець яго мова, калі ў яго ёсьць хоць малая іскрачка сьвядомасьці, а яго ідэалы разрастаюцца і магутнеюць.

Чым цяжэй жывецца нам, падзеляным пяцьма дзяржавамі, чым цяжэй дзень сяголетняшні, тым больш павінны мы думаць аб дню заўтрашнім.

Ні на адзін мамэнт не павінны мы і ня маем права быць падобнымі тым евангельскім сонным дзевам, якія праспалі прыход жаніха.

Хай жа паслужыць нам за прыклад народ мучальнік і герой—народ Польскі, што сто з лішкам год пакутаваў, падзелены між дужэйшымі суседзямі, і вось на нашых вачах уваскрос.

Але хай прыклад гэты пакажа гарачым галовам, што аднаго жаданьня незалежнасьці лішне мала дзеля таго, каб здабыць гэтую незалежнасьць. Каб раздрабіць уціск народаў у часьці Усходняй Эўропы патрэбна была сусьветная вайна. Аднак Англія асталася не кранутая і Ірляндцы да гэтых часоў вядзе адчаянную барацьбу за сваю незалежнасьць.

Нас жджэць яшчэ шмат пераживаньняў, шмат мамэнтаў і сумных, і радасных. Але ні пры якіх варунках не павінны мы губіць з нашых вачэй нашага найвышэйшага незалежніцкага ідэалу, гэты ідэал павінен быць нашай надзеяй, нашым падтрыманьнем і пуцяводнай зоркай у дні нягод і цяжкае барацьбы.

Барацьба, аб якой мы гаворым, гэта не такое простае і прыпадковае аружжа змаганьня, не найлягчэйшая хворма яго, калі людзі ў мамэнт пад'ёму кідаюцца з аружжам на цэлыя арміі, — а барацьба штодзённая, трывалая, бязупынная за наш нацыянальны быт, барацьба нашае сьвядомасьці з чужацкім нацыянальным уплывам, барацьба арганізаванага грамадзянства за сваё права і закон — пры помачы права і закону. Наша барацьба — гэта тварэньне нацыянальнае школы, гэта друкаваньне беларускіх кніг, гэта закладаньне эканамічных арганізацый і каапэратываў, закладаньне усялякіх грамадзкіх арганізацыяў, урэшце—гэта здабываньне для сябе належнага месца ўва ўсіх галінах грамадзкага і дзяржаўнага жыцьця ў гаспадарствах, між якімі нас падзялілі, ў самаўрадах, соймах і т. п.

Такая барацьба вымагае вялікае і глыбокае веры ў нашу будучыну. Яна павінна вясьціся кожны дзень, кожную часіну на усялякім грунце. І чым цяжэйшая яна будзе, чым горшую напасьць нам прыдзецца перажываць, тым ярчэй павінен сьвяціць нам наш высокі нацыянальны ідэал — ідэал не сягоньняшняга дня, а ідэал нашае сьветлае, хоць мо' і далёкае будучыны.

Ува ўсіх гаспадарствах, дзе жыве Беларускі народ, беларусы ідуць па вызначанай тут намі дарозе. І толькі ідучы па ёй мы можам быць пераконаны, што рана ці позна будзе аканчальна і безпаваротна вырашана пытаньне аб аб'яднанай, вольнай і незалежнай Беларусі, — якая будзе раўнапраўным сябрам паміж такімі-ж вольнымі, незалежнымі і сумежнымі з намі краінамі.

Палітычныя падзеі.

Лозанская канфэрэнцыя, якая мае на мэце памірыць Турцыю з Грэцыяй, ці лепш кажучы вырашыць хто з дзяржаў Антанты мае панаваць над пралівамі паміж Чорным і Сярод-земны морамі, зацікавіла ўсе палітычныя кругі сьвету. На канфэрэнцыю зехаліся прадстаўнікі Грэцыі, Турцыі, Італіі, Баўгарыі, Румыніі, Югаславіі, Амэрыкі. Дэлегаты ад Расеі таксама дапушчаны і працуюць у хаўрусе з турэцкімі прадстаўнікамі. Амэрыканскі прадстаўнік выступіў з прапазыцыяй, каб аканчальна быў паложаны канец захватнай палітыцы, каб ні адна з дужэйшых дзяржаў не далучала і не апекавалася чужымі ей землямі.

Страшэнная зніжка нямецкай маркі выклікала міністэрскі крызыс у **Нямеччыне**. На чале новага кабінэту міністраў стаў кансэрватар Куно. Ідуць рабочыя забурэньні, якімі верхаводзяць камуністы.

Польскі Сойм адчыніўся 28 лістапада. На маршалка Сойму выбраны Ратай з партыі пястоўцаў. У час прамовы Ратая беларускія і ўкраінскія паслы дэманстрацыйна выйшлі з залі паседжаньня. Калі Ратай быў міністрам асьветы, дык беларускія і ўкраінскія школы былі ўсюды пазачыняны. На старшыню Сэната выбраны эндэк Тромпчынскі. Па апошніх чутках у Сойме большасьць будзе мець правіца, бо пястоўцы хочуць увайсьці ў хаўрус з эндэкамі. Польскія газэты паведамляюць, што Пілсудскі адмовіўся ад сваей кандыдатуры на прэзыдэнта Польскай рэспублікі, хоць і мог-бы атрымаць большасьць галасоў, але ня хоча быць выбраным галасамі нацыянальных меншасьцяў. Ні адзін парлямэнт у Эўропе не мае такога ліку паслоў-жыдоў як Польскі Сойм.

На адным з апошніх паседжаньняў III інтэрнацыянала у Маскве Ленін сказаў, што **Расея** павінна паступова прыбліжацца да соцыялізму. Трэба прызнаць і пагадзіцца з часовай эканамічнай палітыкай (НЭП). Выказаўся процы вайны. Ленін верыць, што настаў час, калі камуністы мірнай палітыкай ня менш зробяць, што зрабілі да гэтага часу з аружжам у руках.

У Англіі выбары ў парлямэнт далі перавагу консэрватыўнай партыі. Мейсца Лойд Джорджа заняў Бонар Лоу консэрватор, вялікі вораг рабочай клясы і палітычны праціўнік Лойд Джорджа. Безработнасьць у Англіі страшна разрастаецца. Ідуць забастоўкі і многалюдныя дэманстрацыі. Спадзяюцца агульнай забастоўкі. Усяго безработных 1.379.000 душ.

У Італіі хоць улада ужо ў руках фашыстаў, аднак грамадзянская вайна яшчэ ня спынілася. Фашысты і далей нападаюць на соцыялістычныя арганізацыі. Ідуць крывавыя бойкі. Мусоліні, вожак фашыстаў, стаўшы на чале ўраду, адмяніў ужо 8-мі гадзінны рабочы дзень. Абецаў адняць выбарнае права ў жанчынаў, пазбавіць права забастоўкі дзяржаўным служачым і іншае. Заграничную палітыку не зьмяніў і далей таго карыстаецца патрыманьнем Англіі і Францыі.

У Савецкай Беларусі ў прошлым месяцы адбыліся перавыбары саветаў. Шмат прайшло беспартыйных.

Украінцы вядуць адчаянную барацьбу за незалежнасьць **Галічыны**. Польская газэта «Chwila» паведамляе, што польскі ўрад даў шырокае паўнамочча і два корпусы войска г. Галеру дзеля ўспакаеньня паўстанчага руху ў Галічыне. На днях пачаўся суд над 39 камуністамі, якія былі захоплены ў Львове. Між падсуднымі знаходзяцца і цяпер выбраныя пасол у Сойм Крулікоўскі.

Рэвалюцыйны суд у **Грэцыі** засудзіў 6-ць міністраў на растрал. Прысуд выканаваны. Кароль знаходзіцца пад арыштам.

У Ірляндыі пасьля часовага спакою зноў выступіла рэспубліканская партыя, якая змагаецца за незалежнасьць Ірляндыі. Сучасны ўрад моцна занепакоены і чакае рашучых і паважных выступленьняў рэспубліканцаў.

Не Р.С.Ф.С.Р. а Саюз Соцыялістычных Савецкіх Рэспублік.

На зьезде саветаў у Маскве, які мае адбыцца з прычыны 5-ых ўгодкаў бальшавіцкай рэвалюцыі будзе унесены праект аб унарманаваньні адносін рэспублік фэдэрацыі.

Перш-на-перш будзе заменена даўнейшая назва Р. С. Ф. С. Р. на Саюз Соцыялістычных Савецкіх Рэспублік. Кіраўнічай управай конфэрацыі зьяўляецца зьезд саветаў і В. Ц. К. Раўнапраўнымі сябрамі конфэдэрацыі будуць усе аўтономныя рэспублікі саветаў Расея, Украіна, Беларусь, Туркестан, рэспубліка Башкірская, Азербэйджан, Грузія, Армэнія, Дагестан, Далека-Усходня і т. д.

З Савецкай Беларусі.

Рэпэтуар дзяржаўнага беларускага тэатру ў Менску.

У рэпэртуар дзяржаўнага тэатру на селятні сэзон увайшлі гэткія пьесы: „Жрэц Таркіні“—Паліванова, „Павукі і Мухі“ („Кат і сын“)—Сэвэрса, „Машэка“—Міровіча, „Мешчанін у шляхоцтве“ — Мальера, „Кірэй“ — Пахліна, „Бязродны“ — Галубка, „Няскончаная драма“—Ф. Аляхновіча, „Залёты“—Дунін-Марцінкевіча, „Сялянка“ — Дунін-Марцінкевіча, „Сталовыя багі“—Ліцьнава, „Пакрыўджаныя“ — Л. Родзевіча, „Люкрэцыя Борджыя“ (дачка папы Рымскага)—В. Гюго.

Дапамога Сельска-Гаспадарчаму Інстытуту.

Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларусі пастаноўлена перадаць Сельска-Гаспадарчаму Інстытуту Жарноўскае, Лапіцкае і Вяскае лясьніцтвы для выкананьня дасьледаў і іншых навуковых і практычных работ. Разам з тым Інстытуту дадзена права карыстацца прыбыткам з гэтых лясьніцтваў. Аднача сова пастаноўлена адпусьціць 2 міліёны (абразца 1922 г.) руб. на рамонт будовы інстытуту.

Сельска-Гаспадарчае Таварыства.

Пададзены на зацьверджаньне статут сельска-гаспадарскага таварыства перададзен на тымчасовае абмеркаваньне ў Эканамічную Нараду.

З Барысаўшчыны.

Павятовае Прафэсыянальнае Бюро адчыніла прафэсыянальна-тэхнічную школу дрэваапрацоўнікаў на 20 чалавек.

У Нова Барысаве адчыняецца вячэрняя школа вышэйшага тыпу для членаў прафэсыянальных саюзаў.

Клюб, які мяецца пры Барысаўскім Павятовым Прафэсыянальным Бюро, прыведзен у парадак. Пачала працаваць бібліятэка-чытальня. У зьвязку з надышоўшым навуковым годам была праведзена кампанія па зьмяшчэньню дзяцей рабочых і служачых у школы. У Нова-Барысаве вылучана спэцыяльная школа сямёхгодка для дзяцей членаў прафэсыянальных саюзаў. Ва ўсіх школах большасьць окладаюць рабочыя. У горадзе працуюць школы агульнай асьветы, праца адбываецца па вечарох.

З надыходам халадоў і сканчэньнем палявой працы жыцьцё школ па ліквідацыі няпісьменнасьці пачало наладжвацца. Атрымліваюцца патрабаваньні на адчыненьне школ пры прадпрыемствах. Пачаліся камандыроўкі ў школы няпісьменных. У верасьні школы працавалі досыць пасьпешна. У райённых школах вучылася 236 чалавек.

Сельска-Гаспадарчы тэхнікум

(Слуцак).

У Слуцку арганізуецца сельска-гаспадарчы тэхнікум, якому перадаюцца былыя манастырскія будынкі—дом, ток, хлявы і інш., дванаццаць дзесяцін манастырскай ворнае зямлі, тры дзесяціны сенажаці, тры дзесяціны саду на гаспадарчы і паказаўчыя мэты. Студэнтаў набрана на два курсы. Да тэхнікуму далучана адна сямёхгодка, якой прыдаецца сельска-гаспадарчы нахіл. Пэдагагічны пэрсанал тэхнікуму складаецца з лепшых мясцовых сіл, трох вучоных прыродазнаўцаў, вучонага агранома, інструктара сельскай гаспадаркі, інструктара млечнае гаспадаркі і інш. Сюды ж прыцягваюцца й лепшыя мясцовыя беларускія сілы дзеля прыданьня тэхнікуму падстаў мясцовай беларускай навуковай установы.

Лясны тэхнікум.

(Барысаўскі павет).

Прымаючы пад увагу, што ў былой школе другой ст. (цяпер сямёхгодзы) у хутары Рудня на Барысаўшчыне захаваўся падабраны штат кваліфікаваных настаўнікаў, сярод якіх маецца два вучоных лесаводы; што больш пяцьдзесяцьх гадоў—да 1917 году ў Рудні існавала спэцыяльная лясная школа; што ў'кола гэта ляжыць у Вяляціцкім лясьніцтве, у якім захаваліся да гэтага часу пітомнік і частка тэхнічных прылады, як насенная сушылка; што насяленьне Беларусі адчувае вялікую патрэбу ў тэхніках-лесаводах і таксатарах,— Камісарыят Народнае Асьветы палічыў патрэбным і зусім магчымым рэарганізаваць Руднянскую сямёхгодку ў лясны тэхнікум і даручыў Глаўпрафобру ўвайсьці па гэтаму пытаньню ў Нар. Кам. Земляробства дзеля выясьненьня яго погляду і ўдзелу ў арганізацыі намечанага ляснога тэхнікуму.

Я. К.

З Літвы.

Адкрыцьцё Літоўскага Сойму.

26 лістапада адбылося урачыста адкрыцьцё Сойму ў Коўні. Прэзыдэн

Стульгінскіс у сваей прамове шмат удзяліў увагі справе Віленшчыны.

— Літоўскі народ—сказаў прэзыдэнт—ніколі не адкажыцца ад Віленшчыны і ад сваей векапомнай сталіцы Вільні.

Горад быў аздоблены сьцягамі. Школы і дзяржаўныя установы былі зачынены.

Новыя польскія грошы.

Польскі ўрад выпушчае новыя грошы 50—тысячоўкі. Новыя банкноты будуць мець трохі большы фармат, як нядаўна выпушчаныя 10-тысячныя.

У нармальным становішчы дзяржава выдае паперовыя грошы толькі як запамога для таварнага абмену ў нутры края. Лік іх залежыць ад найменшага таварнага абароту і павінна вынасіць меншую палавіну, за то большая палавіна прыпадае на мэталёвыя грошы (золата). Дзе залатой валюты няма і невялікі абарот тавароў, там паперовыя грошы ня маюць ніякай вартасьці, колькі іх не выдавай. Там-жа і расьце дарагавізна.

У Польшчы 20 ліпеня г. г. 10-ць залатых рублёў цанілася 27400 м. п., а 6 сьнежня 89620 м. п.

⁂

Зямлятрасеньня ў Амэрыцы.

У Мэксыцы, Чыле і Сант-Ягу ад зямлятрасеньня згінула 2000 асоб. Адна вёска зусім зьнікла—праваліласяя. Зямлятрасеньне трывала 4 мінуты.

⁂

Крэдытовая каапэрацыя.

Перад вайной у краі істнавала крэдытовая каапэрацыя: былі вясковыя банкі ў якіх за невялічкі працэнт сяляне даставалі пазычку. Працавалі гэныя каапэратывы слаба, далёка стаялі ад патрэбаў працоўнай масы сялянства, а навальніца вайны зьнішчыла іх да шчэнту.

Доўгі час нельга было думаць аб узнаўленьні чыннасьці такіх банкаў і прычынаў называлі дзьве: першае, што ніхто ня дасьць грошаў у такія банкі, калі кожны год нясе палітычную перамену, а грошы ўсе абезцэніваюцца, а другое, дык—быццам, вёска цяпер такая багатая, што ў пазычках ня мае патрэбы.

Можна шмат казаць аб багацьці вёскі, але трэба памятаваць адно: вясковы крэдытовы каапэратыў закладаецца не для тых, хто мае зашмат грошаў, а прад ўсім для тых, хто іх патрабуе, для працоўнай сялянскай беднаты. А што такая на вёсцы ёсьць і што патрэбныя ей грошы яна здабывае з вялікай тугой, аб гэтым сьведчыць той факт, што за пазычаныя грошы пляцяць цяпер ў іншых куткох 10—12 прац ў месяц. Знача, ёсьць хтосьці, хто гэтых дарагіх грашоў патрабуе і за пазычаньне іх плоціць такі аграмадны працэнт.

Багацьцё вёскі неяк кідаецца ўвочы, як пьяны гоман на рынку, але трудную барацьбу за істнаваньне ў цемных няпрыкметных кутках нашай вёскі ня так лёгка разгледзіць.

Другая старана пытаньня — скуль ўзяць грошы, хто іх дасьць няпэўнай беднаце. Вось тут і прыходзіць на помач каапэратыўная арганізацыя. Справа у тым, што, калі ў вёсцы грошы дастаць трудна, бо хоць іх вібы-та і шмат, але як на патрэбу трудна дастаць, дык ў месьце справа стаіць іначай. Блізка, што кожны месцовы банк мае грошаў досьць, наадварот, толькі мае вялікі клопат, куды бы паразсоўваць свае грошы, ды толькі бы ў пэўнае мейсца. І працэнт за грошы ў месце значна ніжэйшы, чым на вёсцы: за 4—5 прац. ў месяц ўжо можна дастаць грошаў, калі толькі даць банку пэўнае забясьпечаньне

Справа, знача, залежыць ад забясьпечаньня.

Гаротніку — селяніну, як раз такі, якому найбольш патрэбна пазычка, каб падтрымаць ці палепшыць сваю гаспадарку, — такога забясьпечаньня банку даць ня можа. Мае ён пару працоўных рук, ды невялічкі інвэнтар і крыху зямлі, дык усё гэта для банку-ня цікавае забясьпечаньне яго грошаў. Такім чынам, для малазямельнага селяніна дарога да танных гарацкіх грошаў—адрэзана.

Іншая справа—калі некалькі такіх селян аб'яднаюцца ў каапэратыў і зьвяжуцца сяброўскай зарукай. З грамадой, якая стаіць на грунце зацьвержанага уладай статуту, банк пачне размову куды ахватней, чым з паасобным няпрыкметным селянінам. Банк пойдзе па спатканьне, а у такім выпадку магчыма павязаньне сталых зносін з грашавым рынкам, толькі бы каапэратыў акуратна спаўняў прынятыя на сябе грашавыя абавязкі.

А гэта залежыць ад умелай гаспадаркі, ад разуменьня задаты свайго каапэратыву. Запраўды, каму можа пазычаць грошы каапэратыў, каму ён можа прыйсьці па помач. Гэта ясна трэба зразумець, каб не павесьці каапэратыў па крывой дарозе і каб пакладаныя падзеі не аказаліся манойіі.

Каапэратыў можа быць карысным толькі для тых, хто патрабуе дапамогі для своей гаспадаркі каму патрэбна грошы, каб ужыць іх на гаспадарскія справы і тым павялічыць выраб (прадукцыю) сваей гаспадаркі.

Калі чалавек проста зьбяднеў і патрабуе пільнай помачы, каб накарміць галодную сямью, адзець яе і абуць, або заспакоіць яшчэ шмат якіх іншых вельмі пякучых патрэбаў—тут мусім адраву прызнацца—крэдытовая каапэрацыя ня ў сілах памагчы такому чалавеку.

Тут патрэбна вышэйшая форма грамадзянскай каапэрацыі, якой мы яшчэ не стварылі. У такіх выпадках апеку павінна прыняць на сябе гаспадарства, або дабрачынныя установы.

А каапэратыў павінен прысьці на помач вось ў якіх выпадках—калі грошы зараз-жа пойдуць у здаровы гаспадарчы абарот: трэба гаспадару вясной купіць каня — ясна, што гэты конь да восені адпрацуе свайму гаспадару узятую па яго пазычку. Трэба купіць добрае сяменьне на азімую сяўбу, а ня час яшчэ прадаваць сабраны хлеб, бо гандляры-перакупшчыкі, карыстаючыся бядой, па паніжанай цане скупляюць у тых, хто змушаны зараз-жа прадаваць свой ураджай—і тут каапэратыў мусіць даць пазычку, бо грошы ідуць на гаспадарскія патрэбы.

Вясковыя крэдытовыя, каапэратывы могуць даваць грошы толькі як вышэй надкрэсьлена, — на здаровы гаспадарчы абарот, а не на хворую спэкуляцыю, або на падтрыманьне прыватнага гандлю. Калі каапэратыў пачынае даваць на гэта грошы—ён робіць ужо на згубу працоўнага сялянства, а не дапамагае яму.

Спачатку каапэратыў можа пазычаць грошы толькі на кароткі срок, (на некалькі месяцаў), але з часам, пры узмацаваньні, каапэратыў павінен прыняць на сябе больш адпаведная заданьні, якія стаяць чарадой: супольная прадажа прадуктаў сельскай гаспадаркі, выробленых сябрамі каапэратыва, супольная закупка рэчаў, патрэбна у гаспадарцы: машынаў і прыладу, сяменьня, нетучнага навозу, утрыманьне стаднікаў, і г. д.

У гэтым кірунку разьвівалася каапэрацыя ў эўрапейскіх краёх з моцнай сялянскай культурай, так павінна пайсьці і у нас, якія бы перашкоды не стаялі тымчасова па шляху разьвіцьця сіл нашага народу. Крэдытовая коопэрацыя яшчэ адыграе сваю ролю ў адраджэньні і нашага працоўнага селянства

I. A.

⁂

З Піншчыны.

Аграмадныя абшары балот у Беларусі ляжаць непатрэбшчынай і ніхто ў сучасны мамэнт не клапоціцца аб іх.

Вынікі ад гідротэхнічнай працы, якая вялася да сусьветнай вайны, далі вялікую карысьць, але пры шкоднай гаспадарцы, якая вядзецца цяпер уласьнікамі балот, асушаныя часьці зноў заменяюцца ў дрыгвы.

Большая часьць балот знаходзіцца ў абшарнікаў. Маючы па некалькі тысячаў дзесяцін балота пан для сваей выгады стараўся часткамі іх асушаць. Дрыгва, куды ў летку залетала толькі птушка, пасьля гідротэхнічнай працы настолькі асушалася, што касец мог працаваць, як кажуць, ног не замачыўшы. Ведама, пракапаньне канаў, утрыманьне іх у парадку патрэбавалі не малыя затраты, аднак гэтыя затраты хутка аплачываліся. Дзесяціна сенажаці ў сярэднім давала 100 пудоў сена.

Шмат карыснай працы па асушцы Пінскіх балот да ваеннага часу палажыў Аляксандр Якобсон, старaючыся найбольш прынясьці карысьці вясковым гаспадаром. А. Якубсон хоць быў чужой нацыянальнасьці, але шчыра палюбіў сваей добрай душой беларусаў. Без усялякай аплаты асушаў ён балоты ў некалькі вёсак, ахвотна кожнаму даваў парады і запамогу. Не адзін працоўны паляшук успамінае яго цяпер добрым словам. Калі ў пачатку 1919 году жыхары вёсак Капачоў і Паварчыц даведаліся, што Якубсон жывець у вялікім недастатку, дык прывязьлі яго з сямьёй за 50 вёрст да сваіх вёсак, дапамагаючы яму хто чым мог.

А Якубсон быў адзін з першых, хто аддаў сябе для пляновай працы па асушцы беларускіх балот. Дзякуючы яму край атрымаў да 50.000 дзесяцін добрай сенажаці.

А. Якубсон радзіўся ў м. Гэрбэргэн, у сучаснай Латвіі 19—IX—1860 года, памёр у Капацэвічах, Слуцкага павету 1921 года, 23 траўня.

Сумны выгляд маюць гэтыя адваяваныя ад балот, у працягу доўгіх гадоў, сенажаці. Канавы пазаплывалі і зарастаюць, шлюзы паруйнаваны, кусты, лес і купьё пакрываюць сенажаці. Абшарнікі, ў гэты трывожны для іх час, баяцца затраціць капітал для рэмонту канаў і шлюзаў, наадварот рабуючы лес края сплаўляюць яго па большых канавах і гэтым аканчальна прыводзяць іх у нягоднасьць.

П.

⁂

Адам Міцкевіч.

Акерманскія стэпы.

Уз'язджаў на прастор сухога акіяну.
Воз гіне ў зелені, як чайка на вадзе;
У хвалях шумных траў, між кветкамі брыдзе;
Мінуючы кусты калючага бур'яну.
Зьмяркаецца. Ня знаць ні шляху, ні кургану.
Гляджу на небасхіл: мо'зорка блісне дзе...
Вось хмарка там—на ёй сьвет водбліскі кладзе:
То за Днястром маяк мігціць ля Акерману.
Спыніліся. Плыве крык жараваў у цішы,
А іх і сокала ня ўгледзіць быстры зрок.
Чутно калі матыль сьцяблінкі траў калыша,
Як сьлізкі вуж паўзе і крыецца ў змрок.
Такі спакой, што каб паклікаў хто ў Літве
Пачуў бы я... Дарма!—Ніхто не пазаве.—

Уладзімэр Жылка.

Жарты пана Пісарэвіча

(*Шматок драмы*).

АСОБЫ:

1. **Пісарэвіч.**
2. **Жонка яго.**
3. **Гаспадыня № 13, Мар'я Іваноўна.**

Дзеецца ў беднай каморцы, якую займаюць Пісарэвічы.

Ява 1-ая

Пан Пісарэвіч у пантофлях на босую нагу займаецца перапіскай.

П. Пісарэвіч. (Пяе). „Чаму-ж мне ня пець, чаму-ж ня гудзець, калі ў маей хатынцы парадак ідзець“... Дастаў шмат перапіскі, зараблю шмат грошы, і справім мы з Стасяю баль. І хлопчыкаў з прытулку возьмем. Хай дзеткі пацешацца. Не бядуй, Стася!.. Прудка скончыцца вайна, паедзем дамоў, ня будзеш стаяць па восем гадзін у калейцы за поўфунта хлеба на картачку. (Пяе). „Ах ты дуй, ах ты дуй, мая Стася, не бядуй! Па маей галаве застанецца ўсё табе!„Адно мяне трывожыць: жывём у гаспадыні—трынаццатай па шчоту. Благое число, хай яно згарыць. Але з гэтай гаспадыняй у мяне дружба: надта-ж упадабала мае гутаркі аб розных цудоўных рэчах у нашым краі. А здаецца, йдзе... ізноў перашкодзе рабіць перапіску, хай на цябе ліха!

Ява 2-ая.

Уваходзіць гаспадыня № 13.

Гаспадыня. Дзень добры яшчэ раз, пан, Пісарэвіч!

П. Пісарэвіч. Ах! Мар'я Іванаўна! Мар'я Іванаўна! Як я рад! Выбачайце толькі, што вы забыліся пастукаць... я ў хатнім выглядзе. Сядайце-ж, калі ласка прашу вас, Мар'я Іванаўна!

Г. (Сядае), Ат! Вечна вы з сваім стуканьнем, пан Пісарэвіч! Ну, прыдзіце раз у мой пакой не пастукаўшыся—пакгітаемся.

П. П. Добра вам казаць, а што мне жонка запяе на гэта?

Г. Які вы жартаўнік, пам Пісарэвіч! Вам няма ведама што ў галаве.

П. П. Калі я гляджу на вас, Мар'я Іванаўна, любуюся на вашы нябескія вочы, дык запраўды я сам ня ведаю, што робіцца ў маей галаве.

Г. Кіньце ўжо, кіньце насьміхацца. Жонцы скажу! А дзе-ж гэта пані Пісарэвічыха? Яшчэ не вярнулася з „хваста“ па хлеб?

П. П. (Глядзіць на гадзіннік). Не, яшчэ не вярнулася; восьмую гадзіну ў „хвасьце“. Добра, што з услончыкам пайшла: можа пасядзець.

Г. Ах пан Пісарэвіч, я дагэтуль не магу насьмяяцца з гэтай вашай выдумкі: услончык у „хвост“ з сабою браць. А якія-ж цяпер хвасты вялікія: сёнейка я бачыла, на цэлую вуліцу ад харчовай крамы расьцягнуўся, аж да рогу і за рог загнуўся. А найбалей стаяць бежанцы.

П. П. Вось, каб лісіцу з гэткім хвастом забіць, шмат грошы можна-б было за скурку пабраць.

Г. А ці ведаеце, ц, Пісарэвіч, я прыйшла да вас па аднэй важнай справе.

П. П. Калі па грошы, Мар'я Іванаўна, дык пачакайце, вось як скончу гэты заказ на перапіску...

Г. (Сьмяецца). Але-ж не, пачакаю, Бог з вамі. Я не аб тое.

П. П. А-а! Ведаю, ведаю. Аб гэтых новых уцекачах? Так угадаў?

Г. Мне здаецца, яны ня будуць плаціць акуратна. Супакойце мяне, пан Пісарэвіч! Вы гэткі вясёлы чалавек!

П. П. А, я надта жартаўлівы. З малку гэтакі. У нас пад Смургонямі ўсе такія. Нязвычайна жартаўлівы народ.

Г. Дык супакойце мяне. Што вы думаеце аб іх, гэтых новых з вашага боку, пан Пісарэвіч?

П. П. Ведаеце, Мар'я Іванаўна, як дзеля вас, скажу па шчырасьці. Мне здаецца, што яны нічога свайго ня маюць, у іх усё крадзенае.

Г. Ах, што вы? Ня можа быць Яны дровы мне пацягаюць.

П. П. О, напэўна, напэўна пацягаюць. Прапалі вашыя дроўцы, Мар'я Іванаўна!

Г. Ах, Божа мой! Парайце, пан Пісарэвіч, што—ж гэта мне цяперака рабіць?

П. П. Ня журыцца, Мар'я Іванаўна! Уздумайце на штокольвек вясёленкае, прыемнае, Мар'я Іванаўна.

Г. Хі-Хі. Ужо ўздумала: як вы казалі, што ў вас ня так, як у нас, не на дрэве а на зямлі яблыкі растуць... Хі-Хі!

П. П. А так, пані гаспадыня. У нас на Беларусі, асабліва пад Смаргонямі, і зімы ніколі ня бывае.

Г. А матачкі! Ото няшчасьце! А як—жа ў вас масьлянка?—бяз каўзяля?

П. П. Чаму без каўзяля? Го-го! Мы сабе з Масквы сьнег выпісваем, а з Варшавы саначкі. Так і пакатаемся і паваляемся... го-го!

Г. Які вы жартаўлівы чалавек, пан Пісарэвіч, скуль у вас што бярэцца. Лацьвей такому жыць на сьвеце, ніколі ня журыцца. Я вас заўсёды з такой прыемнасьцю слухаю. Але трэба йсьці. Задалі вы мне клопату з дрыўмі пан Пісарэвіч. Пайду назначу крэйдаю.

П. П. Крыжыкі пастаўце, пані гаспадыня: дык навет нячыстая сіла не падступіцца.

Г. Жарцікі вам... усё вам жарцікі, ня тое, штоб паспагадаць чалавеку. (Пайшла)

Ява 3-яя.

П. Пісарэвіч. Ці-ж я ей не спагадаю? Ці-ж я ёй не спагадаю? „Ах ты дуй, ах ты дуй, мая міла не бядуй!“ (Дастае з-за печы чурбанок, бярэ бот, вялікую іголку з ніткай, насаджвае бот на чурбанок і пачынае зашываць дзюрку). Я шавец-маладзец! Я шавец-маладзец! (Тымчасам гас-

Грамадзяне Польшчы, якія залічаюцца да меншасьці нацыянальнай, рэлігійнай ці меншасьці па мове, маюць роўнае з іншымі грамадзянамі права закладаць, кіраваць і ўтрымліваць сваім коштам установы дабрачынныя, рэлігійныя і грамадзянскія, школы і іншыя выхаваўчыя установы, а такжа свабоднае карыстаньне ў іх сваей мовай і выпаўненьне абрадаў рэлігійных (Konstytucja Rzeczypospolitej Polskiej art. 110).

Няпісьменных лягчэй няволіць.

У Докшыцкай гміне, Дунілаўскага павету няма **ні аднэй школы.** У м. Докшыцах ёсьць адна занехаеная школа з вучыцелям - паляком, які не разумея беларускай мовы. Сяляне дамагаюцца беларускіх школ. Бёска Тургуны клапацілася аб беларускай школе: сабралі 80 подпісаў, споўнілі усе фармальнасьці, аднак месцовая улада адказала без усякай прычыны. Справа была перададзена Цантральнай Беларускай Школьнай Радзе, але і апошня аказалась бязсільнай супроць „крэсовых" цяркоў.

Эміграцыя за мора.

(пісьмо з Данцыга).

Цяжкае становішча, у якім апынулася беларуская працоўная гушча пасьля далучэньня да Польшчы Заходняй Беларусі, вызвала сільную эміграцыю у іншыя краі, асабліва у Амэрыку.

Едуць у Амэрыку ўсе тыя, хто ня можа перанясьці цяжкіх эканамічных варункаў на Бацькаўшчыне, хто ня мае магчымасьці і трываласьці вясьці барацьбу са зьдзекам над усім родным; едуць да сваіх сваякоў і знаёмых у Амэрыку.

Праз Данцыг, як адзіны польскі порт, усё часьцей і часьцей праходзяць цэлыя партыі беларусаў—у Беларускае Інформацыйнае Бюро, ў Данцыгу, штодзённа зьвяртаецца адзін-другі дзесятак эмігрантаў—беларусаў.

Сярод гэтых эмігрантаў ёсьць шмат вярнуўшыхся з Савецкай Расеі ў родны Край і нашоўшых там сваю зямлю і хату у руках польскіх каляністаў; у каго з такіх нешчасных бежанцаў былі сваякі у Амэрыцы, дык адзіны выхад для іх быў эміграваць зноў на чужыну з крыўдай у душы. Але ёсьць і такія, якія вярнуўшыся з Амэрыкі хацелі загаспадарыць на сваім загоне. Але пачуўшы стогн сваіх суседзяў-вяскоўцаў і пабачыўшыя глумленьня ўсяго роднага, праследаваньня беларускіх культурных праяў вяртаюцца ў Амэрыку, якая дае больш матэр'яльнага і маральнага задаваленьня як падняволеная Бацькаўшчына.

Толькі-ж ня ўсім гэтым згнаннікам і блуднікам удаецца з Данцыга заехаць ў Злучаныя Штаты, куды па іхніх законах трудна папасьці. Шмат хто выежджае ў Аргентыну, Бразылію, Мэксыку, Вэнэцуэлу і іншыя старонкі Паўднёвай Амэрыкі, куды пераехаць свабодней і дзе эмігранты яшчэ могуць разьлічваць на запамогу з боку мясцовага ўраду як атрыманьне работы, льготнай закупкі вучасткаў зямлі і інш.

Шмат хто з гэтых эмігрантаў ужо уладзіліся ў Новым Сьвеце, але аб сваей Бацькаўшчыне не забываюцца. Яны яднаюцца ў гуртку па мсяцовасьцях Бацькаўшчыны і жывуць яе інтарэсамі. Апошнія балючыя падзеі ў Беларусі яшчэ шчыльней зблізілі эмігрантаў. У Злучаных Штатах, дзе ўжо даўней была вялікая калёнія беларусаў, пачынаецца адраджэнскі беларускі рух, які ў недалекай будучыне, трэба спадзявацца, вальецца ў пляновую працу, у моцную арганізацыю.

Пінчук.

Аб Слуцкім паустаньні.

У 1920 г. узгарэўся паўстаньчы беларускі рух проціў чужакоў Зямлі Беларускай. Найбольш шырокія размеры і выразныя мэты свае барацьбы прыняў гэты рух у лістападзе г. г. на Случчыне.

Сёлета ў лістападзе прашлі другія ўгодкі, калі беларусы арганізавана, з аружжам у руках выступілі супроць маскоўскай навалы, дабіваючыся свае незалежнасьці.

Бадай уся Эўропа прыслуховывалася да баёў Першай Беларускай Брыгады Войск Беларускай Народнай Рэспублікі з чужацкай арміяй. Ясна было, што не ўтрымацца сьмельчаком-барацьбістам, якія апіраліся толькі на зрубанаванае вайной сялянства. Апроч таго генарал Булак - Балаховіч рабіў розныя інтрыгі, каб разваліць паўстаньне. Але цікава было з іншага боку: ясна стала усім, што беларускі народ асьвядоміўся настолькі, што прызнаў патрэбнасьць з аружжам у руках дабівацца свае незалежнасьці.

Ужо ня раз беларускае грамадзянства мела магчымасьць на зьездах выказацца за незалежнасьць, але зьезд Случчаны 15 — 16 лістапада найвыразьней паставіў гэтае пытаньне і хоць не дасьпеў час, але стараўся зрэалізаваць сваю думку.

29-га лістапада палілася беларуская кроў у барацьбе за сваю незалежнасьць.

Неўстаялі проці бязмерна дужэйшага ворага.

Астаўшыя ў жывых змагальнікі разбрыліся па сьвеце, уцякаючы ад канцэнтрацыйных лагераў і астрогаў. У нэндзы каратаюць яны сваё жыцьцё на непрыветнай чужбіне і горача вераць, што народ не забыўся іх геройскага выступленьня.

П. З.

У палех Беларусі.

Дзень добры вам, лясы і далі,
Прасторы ціхія зямлі!
Я зноў срэдзь вас, пагоркі-хвалі,
Палоскі цьмяная ральлі!

Вітаю вас, як блізкіх, родных,
Старыя хвоі на палёх,
І вас, красёнцы сьцежак згодных,
Сьляды нялічаных дарог!

І гэты жоўценькі пясочак,
Дзе хвойкі зелена растуць,
Бярозы тыя, што ў шнурочак
За рубяжы зямлі бягуць.

Удоўж рэчкі гэты луг мурожны,
Дубоў разьвіслых цэлы рад
І буслаў дом, стары заможны,
Як той пасэсарскі пасад.

То тут, то там лясок сінее,
У лагчынах рэчачкі блішчаць,
Ад усюль пакоем Божым вее,
На ўсім адна ляжыць пячаць—

Развагі ціхай, задуменьня
І нейкай смутнае красы,
І чуеш у гэтым лятуценьні
Адвечнай песьні галасы.

А хмарка ў небе, ў Божым полі,
Плыве шчасліва, як дзіця,
І забываеш мімаволі
Увесь клопат суднага жыцьця

Куды ні гляне маё вока, —
Усё поўна згоды дабраты...
Ты маеш выгляды прарока,
Наш край пакуты, край сьвяты!

(Водгульле.) *Якуб Колас.*

Да усяго славянскага студэнства.

З славянскае Прагі пасылаем шчыры прывет Вам, сёстры і браты, усюды дзе Вы толькі вучыцеся.

Ужо даўно, як апошні раз адазваўся голас, што гукаў да славянскага студэнтскага сьвету.

Вялікая вайна як бура зьніштожыла працу зробленую на ніве славянскае узаемнасьці.

Настала бітва найгоршая з усіх, бітва за жыцьцё. Брат біўся проці брата, шалела вайна.

Ваенны шал і ненавіднасьць атруцілі на доўга нашую кроў.

Цяпер працуем. Праца нам прыносіць супакоеньне.

Бура, што уляглася, ачысьціла паветра. Глядзім у далёкі горызонт.

Мы пакаленьне вялікіх здарэньняў. Мы надавячы перажылі вялікія справы. Вялікшыя яшчэ нас чакаюць.

З сягоньняшняга гарызонту прыслухоўваемся да будучага нашага вялікага, што нас заахвочуе да дзейнасьці, гукае да працы.

Чуем прыход новае працы у гісторыі людзкасьці. Перад нашымі вачыма, асьлепленымі яшчэ агнём вайны, цямцяцца абрысы новае пары, як сілуэты вялізарнае сьвятні Новае культуры.

Мы ведаем, якое вялізарнае значэньне мае культурнае зьбліжэньне усяга славянскага студэнства. У ім мы бачым сваю славянскую сілу.

Мы хочам, каб ужыцьцёвілася духовае брацтва студэнства усіх славянскіх народаў.

Ня гледзячы на тое, што яшчэ цяпер ёсьць шмат перашкод, мы імкнёмся з усіх сіл, каб як найбарджэй прышоў дзень, што будзе перамогаю нашае думкі.

Дзеля гэтага падымаем свой голас, а кіруючыся пастановамі Загрэбскай і Праскай гукаем Вас на **Конгрэс Славянскага студэнства**, які адбудзецца на **Каляды сёлета у Празе.**

падыня узьнімаець голас яшчэ на падворку: „Чурбанка няма! Чурбанка няма!").

Ява 4-ая.

Гаспадыня. Дзе мой чурбанок? Сьцягнулі-ткі чурбанок! А каб гэтых бежанцаў, сьцягнулі чурбанок!

П. Пісарэвіч (Схаваўшы чурбанок з ботам за сьпіну). Выбачайце Мар'я Іванаўна, што вы не пастукалі: я ў хатнім выглядзе, боты сабе рэпараваў. (Скача на адной назе). Дылі-дылі, го-ца-ца-ца! Ды-лі, дылі, го-ца-ца!

Г. Кіньце свае жарты, пан Пісарэвіч! Чурбанка няма! Ці ня відзелі вы часам?

П. П. Вядома, Мар'я Іванаўна: уцекачы сьцягнулі, дальбог уцекачы!

Г. Насланьнё мне з гэтымі уцекачамі... Сьцягнулі-ткі чурбанок!

П. П. Яны бачылі, дурныя, і думалі, што гэта кавалак мяса. Дык вось яны схапілі у ночы, а цяпер вараць...

Г. Што?!

П. П. Вараць, дальбог вараць.

Г. Ня сорам вам бажыцца, пан Пісарэвіч? Ці-ж гэта можа быць?!

П. П. Можа ня зусім так, але каля таго. Калі ня йміце веры, то вось, Мар'я Іванаўна... (Цягне з-за сьпіны чурбанок). Трымайце! Я на ім боты рэпараваў, а думаў сабе: пасьля звару ды зьем, Дальбог думаў! Але неякась пашкадаваў. Бярыце, Мар'я Іванаўна: мо' калі голад будзе ў вашай губэрні, — ня вам, дык добрым людзям спатрэбіцца замест кавалка мяса...

Г. А я спалохалася: дзе, думаю сабе, падзеўся мой чурбанок? Аж вы з сваімі жартамі...

П. П. Дык бярыце, Мар'я Іванаўна, толькі добранька схавайце, ато бежанцы сьцягнуць.

Г. Рэпаруйце, рэпаруйце боцікі пасьля забяру. (Пайшла, а ён садзіца за боты).

Ява 5-ая.

Прыходзе за нейкі час ж о н к а з услончыкам і фунтам хлеба. сядае і плача.

П. Пісарэвіч (Пяе). Ня плач, ня плач, мая Марусенька, ня плач, ня журыся, дый за сьвятое шаўца-краўца Богу памаліся...

Ж о н к а. Божа мой! Божа мой! (Плача трасучыся, ня могучы стрымацца).

П. П. (Кідае бот і ўстрывожаны падыходзе да жонкі). Стасенька, міленькая, супакойся!

Г. Да чаго мы дажыліся, да чаго мы дажыліся...

П. П. Да чаго там дажыліся? Дажыліся казакі—ні хлеба, ні сабакі... Бывае горш, вялікая рэч! Супакойся, Стасютка... (цалуе рукі). Паўзірайся, колькі я аркушаў сьпісаў — кучу грошы дастану, баль справім. Дзяцей на сьвята з прытулку прывядзём. Ну, Стасенька... Вайна скончыцца, дамоў паедзем.

Ж. Дамоў... Дамоў...

А. Мсьціслаўскі.

У выгнаньні.

Атрымала я вестку з роднай краіны: вось цэлы жмут газэт прада мной... Сэрца б'ецца з радасьці вялікай, з нецярплівасьці рукі дрыжаць.

Хутчэй, хутчэй-жа чытаць! Як жывуць усе там нашы? Як праца ў іх там ідзе? Што чуваць? Ці народу лягчэй ужо жыць?

Прачытала...
За што, за што так церпіць народ наш?
За што калечаць душу, рабуюць скарбы яго?
З якога пекла там сілы пануюць?!

Вочы сухія палаюць агнём, у душы бурліць боль.

Выць, кідацца й кусаць... А мо дзіка бязудзержу пачаць рагатаць?

Сунімаецца вострая боль на хвіліну. Я нічога ня бачу—ня чую... Цішына, як на магілках цёмнаю ноччу за вёскай глухой. Далёка недзе выюць сабакі.

У галаве, апусьцеўшай ад думак талковых, уецца песьня страшная; дыссанансаў у ёй поўна, дзікіх крыкаў, выцьця, А за кожнай звароткай — прыпеў жудкі, страшны і працяжны, як удары звана на пажар:

Гвалт... Гвалт.., Гвалт...

Не магу я на мейсцы сядзець! Пабягу—уцяку ад самое сябе.

Сёньня сонца прыгрэла—вясна на дварэ. Апынулася я аж у парку. Як вясёла тут птушкі пяюць! Вясна...

І ў нас там таксама хутка будзе вясна. Пацекуць ручайкі, рэчкі за сну праснуцца, рунь так міла на полі зазьяе...

Прыпасьці б грудзямі к роднай зямельцы сырой, абнімаць, цалаваць, сьлёзы радасьці ліць разам з птушкамі песьнямі сьцявацъ і гукнуць на ўвесь сьвет:

„Есьць радасьць у жыцьці! Есьць шчасьце і праўда! Есьць воля сьвятая!.."

Дзе? Там—у нас?

Гвалт... Гвалт... Гвалт...

Бач, як дзеткі сьмяюцца! Так цёпленька адзеты... У аднаго булачка, ў другога шакалад у руках. Бацька кніжку у падарак купіў... Там вось, лялька, якая. Той у трубку мядзяную дзьмець...

А нашы там дзеткі?

Гвалт... Гвалт... Гвалт...

О, уладар сусьветам, часы і абшары! Чаго-ж хочаш ад нас?! Якой яшчэ патрабуеш ахвяры?! Няўжо мала табе яшчэ мук, паняверы, крыві, сьлёз?

Грахі продкаў сваіх, хто наш край запрадалі, мы сьлязамі даўно ўжо змылі! Сьлёз ня стала—мы крывёй абмывалі... Даўно адпакуталі. Годзі! Чаго-ж хочаш яшчэ!

Пачуй стогн душы маей.

Гвалт... Гвалт... Гвалт..!

Паўлінка.

Бэрлін.

Чытай! Распаўсюджывай! Падпісывайся!

Хто жадае вольнай і сьветлай будучыны для Беларусі, каму дорага справа яе адраджэньня хто шануе, матчыную мову і змагаецца за праўду працоўнага люду хай падпісываецца на газэту **„Наша Будучына“** і усюды пашырае яе. Хай у кожным занепалым кутку Беларусі пазнаюць і прыхінуцца да **„Нашай Будучыны“**, якая

хаець сумную сучаснасьць,
раскрывае варожыя замыслы,
выражае і крысталізуе думкі народу,
адкрывае новыя праўды,
бароніць заваёванае і здабытае крывавым мазалём,
будзіць творчы дух да волі і хараства і
паднімае ўзрост роднай культуры.

Друкованае слова мае аграмаднае значэньне ў змаганьне за дабрабыт Краю, за лепшую будучыну.

Ворагі гэта разумеюць і ніштожаць, як сваю небасьпеку, беларускія газэты на поштах, пры вобысках і г. д.

І мы павінны зразумець карысьць ад свайго друкаванага слова, павінны выпісываць **„Нашу Будучыну“** і складаць ахвяры, каб забясьпечыць ёй доўгае бытаваньне і бараніць ад напасьці самавольнікаў.

Каб гэтая часопісь была сапраўднай вашай газэтай і шматчаканай будучынай, дык кожны падпішчык павінен быць і яе супрацоўнікам. Каб беларус з пад Нёмна ці Дзьвіны знаў, чаго дамагаецца і як жывець пінчук альбо беларус, які жывець у чужбіне. Толькі аб'едналыя беларускай працоўнай праўдай, злучаныя ў адналітую грамаду мы дружнай працай даб'емся нашай пакутнай Бацькаўшчыне належучую ёй лепшую будучыну.

Рэдакцыя.

каб пазнаць, добра інформаваць, зблізіцца, каб знайсьці аснову сьпрацоўніцтва, каб яе як ужыцёвіці, каб дайсьці згоды аб судзейнасьці на міжнародным полі, каб пагутырыці аб усім тым, што маем на сэрцы, галоўна аднак, каб пачаць закладзіны новае веры, веры ў вялікую будучыню славянскіх народаў.

Прыгатоўчы Камітэт.

Дописы.

Няма сьмерці бяз прычыны. У вёску Маразовічы, Навагрудзкага павету а 12 гадзіне ночы зашло некалькі жаўнераў з 4 баону 25 палка. Зайшоўшы ў хату Ганулі Гордэр у ліку 7 асоб запыталіся ці няма ў яе хаце іхняга таварыша. Гаспадыня сказала, што няма, дык жаўнеры не паверылі і пачалі шукаць. Пасьля іх вобыску гаспадыня шмат чаго не далічыла.

Ю. Б.

Szlachciec na zagrodzie-równy wojewodzie або--„власть на местах“ Павятовыя Старасты горш даўнейшых Спраўнікаў. Яны самаволяць і забаўляюцца з народа. Было ось здарэньня у Дунілавіцкім павеце. 4 лістапада, якрас перад выбарамі Павятовы Стараста распарадзіўся арыштаваць з кожнай воласьці па некулькі чалавек вядомых працаўнікоў—беларусоў і даставіць аж у Дунілавічы да сябе. (але ня ў госьці). Сказаць праўду арыштаваным—навошта іх сабраў Стараста—няма патрэбы, бо усе ведалі, што гэта панскія выкрутасы перад выбарамі у Сойм, дык арыштаваным напомнілі ў старостве, што ў Коўне ёсьць беларускі урад Ластоўскага, што арыштаваныя як Беларусы, ды яшчэ прычасныя да Беларускага Выбарнага Камітэту, мусюць знацца з Ластоўскім. Назаўтра арыштаваных пусьцілі дамоў. Паслам-беларускім у Сойме трэба даведацца ў Міністра Спраў Адміністрацыўных—ці ня можна былоб «падзякаваць» Старасьце за стараньне праз меру—за безупынныя арэшты і падпіскі, аб ня выязьдзе—якбы які сумысны тэрор, каб больш нідавольства ў народзе зрадзіць, каб больш напрыкрыцца народу і папрасіць Старасту пашукаць службы там, дзе за нарушэньне закону і крыўду народную ён атрымаў-бы добрую навуку.

Анюоб.

З Беларускага жыцьця.

— **У Віленскай Беларускай гімназіі.** З прычыны таго, што Дырэктара гімназіі п. Б. Тарашкевіча абралі ў Сойм, яго абавязкі спаўняець п. Трэпка.

На адбыўшымся 26 мінулага лістапада „паседжаньні Педагагічнае Рады вырашана адкрыць пасьле Каляд прыймо ў гімназію, ува ўсе клясы апрача восьмой, каб даць магчымасьць селянам прывяці сваіх дзяцей у гімназію, не згубіўшы цэлага году.

Уступныя экзамены адначасна з усіх прадметаў пачнуцца 15 студзеня 1923 г. і працягнуцца да 1-га лютага.

— **Як гэта разумець?** У Радашкоўскай Беларускай Гімназіі сярод вучняў арганізаваўся гурток моладзі, які дзякуючы сваей дзейнасьці мае ўжо сваю бібліатэку, ладзіць вечарыны, чытаець рэфэраты і інш. Здавалася-б што кіраўнікі маладой гімназіі павінны былі-б заапекавацца і заахвоціць да большай дзейнасьці і арганізованнасьці, а тымчасам „вядомы“ Тодар Вярнікоўскі пачаў з таго, што стаў руйнаваць ужо створанае вучнямі і угражаў звальненям з гімназіі да тых часоў, пакуль вучні не адкінуліся ад сваей маладой арганізацыі. Як нам ведама гэты Вярнікоўскі займае ў Гімназіі пасаду дзелавода.

Дык што робіць Пэдагагічная Рада? І ці ведае аб гэтым Цантральная Беларуская Школьная Рада?

— Пры Варшаўскім Унівэрсытэце студэнты — беларусы арганізавалі свой гурток.

— **У Беларускай Гімназіі ў Навагрaдку** выклады ў 3 ніжшых клясах ідуць у мове беларускай, у старшых клясах ў расейскай мове. Фактычна гэта не адна, а дзьве Гімназіі, бо маюць двох асобных кіраўнікоў: кіраўніком беларускіх клясаў з'яўляецца Цеханоўскі, а кіраўніком расейскіх Скрабец.

— У канцы лістапада зацьверджаны урэшце статут „Таварыства беларускай школы пачатковай і сярэдняй“. Працадура па адчыненьню таварыства цягнулася ад 1-го траўня г. году. Найбольшую дзейнасьць у адчыненьні таварыства выказалі: Данілевіч, Скрабец, Шумскі, Львоў і Друцкі-Падбярэцкі.

Трэба спадзявацца, што таварыства пачне адчыняць пачатковыя беларускія школы, бо цяпер нямашака аніводнай беларускай школы пачатковай у Навагрaдчыне. А народ школ беларускіх жджэць і патрабуе.

N.

— Арыштованы за перадвыбарную агітацыю беларускі вучыцель м. Краснае **Крыткоўскі** яшчэ да гэта часу сядзіць у Лукішскім вастрозе.

— Вышла з друку і прадаецца у беларускай кнігарні новая кніжка Л. Родзевіча „Беларусь“.

— Грамадзянін А. Грыневіч ахвяраваў для Беларускай Драматычнай Майстроўні ніжэйпададзены сьпіс рэквізытаў: два андаракі, шнуроўка, кашуля жаночая, хвартух, пояс, дзьве пары нагавіц, мужчынская кашуля, дзіцячыя аксамітныя тупалькі, дзіцячыя чаравічкі і мужчынскі парык. Гэтая ахвяра хай паслужа прыкладам для беларускага грамадзянства, каб падтрымаць маладую мастацкую установу.

— **Беларускі канцэрт-лекцыя.** У нядзелю 10 сьнежня адбудзецца у залі Драматычнае „Майстроўні (Вострабрамская 9) канцэрт-лекцыя. М. Гарэцкі прачытае лекцыю аб Фр. Багушэвічу. Беларускі хор прапяе народныя песьні. Пачатак а 6 г.

— Старшынёй Беларускага Пасольскага Клюбу выбраны пасол у Сойм Дырэктар Белар. Гімн. у Вільні Б. Тарашкевіч.

— Вывеску, напісаную пабеларуску на дзьверах Беларускага Пасольскага Клюбу ў Сойме палякі сарвалі.

Віленскі Беларускі Камітэт помачы пацярпеўшым ад вайны.

З прычыны сучаснай дарагоўлі Камітэт абмяжоўваецца толькі утрыманьнем беларускага дзіцячага прытулку ў Вільні, у якім налічаецца 96 дзяцей-сірот, паўсірот і дзяцей бедных бацькоў наагул і асабліва тых, якія нядаўна вярнуліся з Расеі. Дзеля недахвату месца ў прытулку і з прычыны недахвату коштаў ў Камітэце прыймо дзяцей ў прытулак спынена.

У арганізаваным Камітэтам ў верасьні гэтага году Беларускім Школьным Інтэрнаце на Зарэччы месьціцца цяпер 27 асоб—вучняў Віленскае Беларускае Гімназіі. Камітэт пры грашавой дапамозе з боку Цэнтр. Бел. Шк. Рады зрабіў адпаведны рэмонт памешканьня, набыў інвентар, дастаець акуратна на кожны месяц дадаткавае дакарменьне ад П.-А. К. П. Д., дастаець па таннай цане апал для інтэрнату. Усім гэтым Камітэт зрабіў пражыцьцё ў Вільні для прыезджых з правінцыі вучняў значна выгаднейшым і лягчэйшым.

Прытулковыя дзеці вучацца ў беларускай пачаткавай пры гімназіі школе, а значная большасьць іх вучыцца ў Віл. Бел. Гімназіі. Сярод прытулковых дзяцей ёсьць адзін мастак-самародак і дзьве досыць здольныя маладыя паэткі. Істнуе хор дзяўчат з значным беларускім рэпэртуарам.

Інтэрнацкія вучні выдаюць на шапірографе сваю вучнёўскую часопісь „Зорка“.

Беларусы у Латвіі.

— **Беларус у гарадзкой думе.** У Люцынскую Гарадзкую думу выбраны беларус С. Сахараў кіраўнік Беларускага Аддзелу.

— **Курсы Беларусазнаўства ў Люцыне.** Закончыліся курсы беларусазнаўства для вучыцялёў беларускіх школ. Курсы вела грам. Паўліна Мядзіолка-Грыб, лекцыі якой мелі вялікі сусьпех. Пасьля закончаньня курсаў адбылася вечарынка.

— **Беларуская Гімназія ў Дзьвінску.** Кончыўся рэмонт будынку беларускае ўрадовае гімназыі ў Дзьвінску. На рэмонт Беларускі Аддзел асыгнаваў 300.000 л. руб. Заняткі пачаліся ў верасьні.

Дзеляць нашу зямельку.

Міністэрттва вайсковых спраў прыступае да ўкладаньня сьпіску кандыдатаў на жаўнерскія надзелы ў так завомых Усходніх Крэсах на 1923 год.

З Косаўскага павету паведамляюць, што маёнтак Св. Воля распарцэляваны для асаднікаў на 1923 г. Адзін з іх Серацкі з пад Варшавы ўжо прыехаў і напіўшыся пабіў свайго гаспадара дзе кватаруе, Гауса і сына з вёскі Ягневічы.

Усе ўспомнілі беларускую мову.

У час перадвыбарнай дзейнасьці па усей Заходняй Беларусі „Саюз пралетараў гарадоў і вёсак“ (камуністы) вёў агітацыйную арацу на беларускай мове. Навет адозвы і праграмы друкаваліся пабеларуску. А ў Горадні выходзіла газэта ў беларускай мове пад назваўнем „Вясковы Пралетары“. Газэта гэтая строга стаяла на прынцыпе клясовай барацьбы і падчырківала патрэбу разгляду нацыянальнага пытаньня ў беларускай вёсцы і шмат давала месца для разгляду беларускага жыцьця ў Заходняй Беларусі.

.Беларускі рух на Вітабшчыне.

У месяцы кастрычніку ў покоях стралковага палка ў Вітабску маладым беларусам Касянковым (Зарэцкім) была прачытана лекцыя на тэму: „Нацыянальна-культурнае адраджэньне Беларусі“. На сходзе былі прысутнымі палітычны камандны састаў палка ў ліку 50 чалавек,— сярод іх шмат чырвонаармейцаў.

Зьмест лекцыі быў гэткі:

Кароткі агляд гісторыі беларускага нацыянальнага руху, асабліва ў пэрыяд з часу рэвалюцыі 1918 г.,

Гэтая лекцыя надта зацікавіла сходку, і лектару было зададзена ў сувязі з гавораным шмат пытаньняў, на якія ён даваў адказы.

Зададзеныя пытаньні добра характэрызуюць, у якой стадыі разьвіцьця знаходзіцца беларуская самапачуцьцё ў палітычных і камандных кіраўнікоў аднаго з палкоў, складаючагася чуць ці з адных беларусаў.

Галоўнейшыя пытаньні гэткія:

Ці магчыма разьвіцьцё беларускай культуры і ці знойдуцца дзеля гэтага працаўнікі?

У які час насаджвалася на Беларусі польская і расейская культура?

Чаму няма агульнай беларускай мовы і чаму, напрыклад, у Вітабшчыне і Меншчыне гавоpуць розна?

Лекцыя гэта была прачытана на расейскай мове, а калі некаторыя з прысутных пажадалі паслухаць беларускую мову, то лектарам з вялікім натхненьнем было сказана пасьля ўсяго заключнае слова пабеларуску, што зрабіла надта добрае ўражаньне на прысутных, лектар быў запрошаны на агульны сход прачытаць лекцыю пабеларускаму пытаньню.

Алеся Гаротная.

Перасьцярога для эмігрантаў.

Каб ня быць эксплатаванымі праз розных агентаў раем усім беларусам, выежджаючым на чужбіну, зьвертацца за спраўкамі да Беларускага Інфармацыйнага Бюро ў Данцыгу. Адрас такі: Weissruthenisches Informationsbüro. Danzig, III, Damm, № 11.

З Вільні.

Мітрапаліт Юры ў Вільні.

У нядзелю, 3 сьнежня ў Вільню прыехаў Мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Праваслаўнае царквы ў Польшчы Юры.

Разам з Уладыкай прыехалі і сябры Асьвячонага сыноду: Япіскап Аляксандар, кіруючы Палескай эпархіяй і япіскап Луцкі Аляксей.

З цягніку Уладыка прыбыў у Сьв.-Духаў манастыр, дзе яго спаткала ўсё духавенства і праваслаўныя парафіі м. Вільні.

Управа Беларускага Таварыства Сьв. Тройцы, вітаючы Мітрапаліта, выказала надзею, што з яго прыходом настанець новая эра ў жыцьці праваслаўнага беларуса, калі ён пачуе навуку на роднай мове, і паднесла Мітрапаліту хлеб і соль.

Мітрапаліт быў у Беларускай гімназіі, дзе высказаў сваю прыхільнасьць да беларусаў.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

Афіцыяльна за 6 сьнежня.

Нямецкія маркі	2.10
Осты	1.70
Доляры	17.230
10 руб. золатам	89.620

Бібліяграфія.

У Бэрліне выдадзены Навукова-Літэрацкім Аддзелам Камісарыяту Асьветы Б. С. С. Р. 1. Тэраўскі Ул. Беларускі лірнік. Сьпеўнік на чатыры галасы. 2. А. Кругалевіч. Элемэнтарная альгэбра. І частка. 3. Цыгельман. Аснаўныя пачаткі арытмэтыкі. 4. Цішка Гартны. Песьні працы і змаганьня. Зборнік вершаў. Кніга зьмешчае ў сабе 68 вершаў, складаецца з трох частак І. Песьні працы. ІІ. Чырвоны золак, і ІІІ. Змаганьне. Яго-жа. Сокі цаліны. Раман у трох частках.

„Беларускі Этнограф“. Выданьне Вітэбскага Аддзелу Маскоўскага Археалягічнага Інстытуту. 1922. Першы нумар вышаў у красавіку.

Рэдактар-выдавец А. АМЕЛЬЯНОВІЧ.

Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.